**Я.Р. Рыер**
***(Магілёў)***

# СЯРЭДНЯВЕЧНЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ І БЕЛАРУСЬ

Асноўнымі цывілізацыямі ў сярэднявеччы былі кітайская, індыйская, якія склаліся ў старажытнасці, а таксама тыя, што стварыліся ў раннім сярздня-веччы: араба-мусульманская (якая ўключыла ў сабе рэшткі старажытных цівілізацый Блізкага Ўсходу, Персіі і Сярэдняй Азіі), візантыйская, заходне- і ўсходнееўрапейская, цывілізацыі Трапічнай Афрыкі і дакалумбавай Амерыкі.

Пад цывілізацыямі разумеецца цэлы комплекс эканамічных, сацыяльна-палітычных, культурна-ідэалагічных, этна-псіхалагічных, дэмаграфічных і прыродна-геаграфічных параметраў існавання канкрэтных грамадстваў у вызначаны гістарычны пярыяд. Гэтыя параметры ствараюць даволі складаную мазаіку ў той ці іншай цывілізацыі і не маюць выразна акрэсленай іерархіі - у залежнасці ад унутраных ці знешніх умоў вядучыя і «падначаленыя» параметры могуць мяняцца месцамі. У працзсе генезіса і развіцця цывілізацый, іх кантактаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і сутыкненняў узнікалі памежныя, пераходныя, неўстойлівыя і дынамічныя формы, якія можна был б назваць цывілізацыйнымі мадэлямі.

Аналіз генэзіса еўрапейскіх супольнасцей пры распадзе першабытнасці дазволіў выдзяліць ў варварскім свеце тры рэгіянальныя мадэлі: заходне-, цэнтральна- і усходнееўрапейскую. У заходнееўрапейскй мадэлі былі сінтэзаваныя асноўный элементы старажытнагерманскай і антычнай супольнасцяў з пераваладаннем прыватнаправавых і дагаворных асноў у эканамічным (землеўладанне), грамадскім і дзяржаўным жыцці. Цэнтральна- і ўсходнееўрапейская мадэлі развіваліся на падставе славянскіх культур лясной зоны Еўропы, якія скла- ліся ў жалезным веке і захавалі ў раннім сярэднявеччы абшчынныя парадкі з калектыўным (затым карпаратыўным) землеўладаннем.

Да мяжы I/II тыс. заходнія славяне пачалі ўсё больш цесна ўзаемадзейнічаць з заходнееўрапейскім супольніцтвам, якое на працягу ранняга сярэднявечча ўжо склалася ў спецыфічную заходнееўрапейскую цывілізацыю на падставе прыватнаўласніцкай сяньёрыяльнай формы феадалізма. Узмацненне ўзаемадзейніцтва з Заходняй Еўропай характэрызуе спецыфіку стварэння і развіцця цэнтральнаеўрапейскай мадэлі на працягу ўсяго II тыс. У гэты час адбывалася накапленне адрозненняў адзначанага рэгіёна ад Усходняй Еўропы, дзе феадальныя парадкі ўсё больш набліжаліся да класічных усходніх цывілізацый, што і складала спецыфіку ўсходнееўрапейскай цывілізацыі ў сярэднія вякі.

На беларускіх землях пры пераходзе ад варварства да раняй дзяржаўнасці адбываліся працэсы, тыповыя для ўсходнееўрапейскай мадэлі. Са стварэннем Вялікага княства Літоўскага, з XIV ст., пачаліся працэсы збліжэння з цэнтральнаеўрапейскімі цывілізацыйнымі параметрамі. Асабліва інтэнсіўна гэта адбывалася ў XVI-XVII ст.ст. У першую чаргу яны закранулі шляхецкае сасло'е і гараджан. Сяляне заставаліся больш, натуральна, кансерватыўнымі. Таму ўключэнне заходніх цывілізацыйных парамертаў на нашых землях аказалася частковым і досыць павярхоўным, не закранула глыбінныя асновы традыцыйных стэрэатыпаў. Таму і наступнае разбурэнне Рэчы Паспалітай і ўключанне беларускіх зямель ў склад Расійскай імперыі вярнулі іх у рамкі ўсходнеславянскай цывілізацыі.

Такой бачыцца агульная схема нашага развіцця. Чым яна абумоўлівалася і дзе шукаць парадыгму нашага развіцця? Бо менавіта адказ на гэтыя пытанні і павінны даваць гісторыкі, адсякаючы рэальныя факты і іх навуковую інтэрпрэтацыю ад міфаў.

Перш на перш - аб адносінах да сярэднявечча. Цяперашнее яго разуменне ў нашай гістарыяграфіі не вызначаецца дакладнасцю. Ад ранейшай савецкай схемы (атаесамленне сярэднявечча з феадалізмам, а апошняга - з заходняй яго мадэллю і датаваннем V-XVII стст.) адлучылі 2 апошніх стагоддзя, каб храналагічна наблізіць гэтую эпоху да заходняга разумення і... амаль - усё. Не адбылося пераасэнсавання сутнасці таго,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што адбывалася ка нашых землях у тыя часы. Ды і сама заходнееўрапейская храналогія для нашай гісторыі яшчэ больш неп, рыдатная, чым савецкая. Апошняя зыходзіла з перабольшавання ролі сацыяльна эканамічных фактараў чалавечага існавання.[1] Але па свойму яна лагічна. І ў XVI, і ў XVII стст. усходнееўрапейскія сацыяльна-эканамічныя парадкі істотна не адрозніваліся ад тых, што існавалі ў папярэднія вякі. Заходнееўрапейская храналогія стварылася на зусім іншай аснове і абапіраецца перш за ўсё на гісторыю культурнага развіцця. Але і з гэтага пункта гледжання мяжы паміж XV і XVI стст. у нас не назіралася.

Асноўныя рысы сярэднявечча і ў культуры, і ў быце, і ў эканоміцы, і ў сацыяльных парадках, і, нарэшце, у палітычных з'явах у нас захоўваліся, па сутнасці, да другой паловы XIX ст. Бо і Вялікае княства Літоўскае, і Рэч Паспалітая, і Расійская імперыя - па ўсіх сваіх параметрах - сярэднявечныя ўтварэнні з панаваннем дваранскага саслоў'я, якое абапіралася на манапольнае землеўладанне. Асноўным ствaральным саслоў'ем заставалася сялянства. Гарады былі, у параўнанні за Захадам, слабымі і іхняе насельніцтва не адыгрывала значнай ролі нават у эканоміцы, не гаворачы аб палітыцы і культуры. Натуральна, былі рэгіянальныя адрозненні, аднак яны не выходзілі за межы агульных феадальных парадкаў, пад якімі я разумею перш на перш землеўладніцкія.

Для Беларусі істотнай мяжой сталі падзелы Рэчы Паспалітай, у выніку якіх яна апынулася ва ўладзе феадальнай, але больш па-ўсходнему жорсткай, цэнтралізаванай, імперскай структуры. Дарэчы, і інкарпарацыя ВКП у Рэч Паспалітую, і крызіс, затым і катастрафічнае ліквідаванне апошняй - таксама яскравы паказчык немагчымасці існаванная ў феадальнай сістэме такіх сур'ёзных дэмакратычных інстытутаў, як парламентская рэспубліка са спікерам у выглядзе караля.

Але і канец XVIII ст. стаў для беларускіх зямель не канцом сярэднявечча, а канцом існавання ў межах цэнтральнаеўрапейскай сярзднявечнай цывілізацыйнай мадэлі і падпарадкаваннем усходнееўрапейскай сярэднявечнай цывілізацыяй, асноўныя параметры якой захаваліся, як вядома, і сёння.

Гэтак жа праблематычна пачынаць у нас сярэднявечча з пачатку другой паловы I тыс. Для Ўсходняй Еўропы гэта хутчэй гістарыяфафічная «адрыжка» былой савецкай барацьбы «з нізкапаклонствам перад Захадам», чым вынік навуковых распрацовак. Успомнім, што калі на большую частку германскіх зямель спецыфічныя парадкі, пазнее названыя феадальнымі (цяпер, дакладнее - сеньёрыяльнымі) былі занесены войскамі Карла Вялікага, прычым ў другой палове VIII ст., на ўсходзе ад Эльбы асабістыя дзяржаўныя структуры пачалі

[1] Яшчэ на пачатку XX ст. С.Булгакаў слушна зазначаў, што не эканамічныя парадкі вызначаюць аснову чашвечай дзейнасці, як лічылі К.Маркс і яго паслядоўнікі, а паўсядзённыя патрэбы людзей ствараюць міжчалавечыя адносіны, у тым ліку эканамічныя і сацыяльныя.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

складацца толькі ў IX ст., як, дарэчы, і ў Скандынавіі. А.І.Неўсыхін нездарма адносіў часы пераходу ад першабытнасці для дзяржаўных структур нават ў Заходняй Еўропе дафеадальнымі. Пэўнай, але паказальнай вехай змены мірапоглядаў, хаця б у правячай эліты, сведчыць яе адыход ад так званага звычайнага права і стварэнне судзебнікаў - знакамітых варварскіх «Праўд». У германцаў яны з'явіліся ў VI-VII стст., але пад значным рымскім уплывам, а калі яны пісаліся ў славян? А чаму не раней рубяжа I/II тыс.? Таму што да таго часу княскія дружыны не мелі іншых правоў, акрамя традыцыйных і не мелі патрэбы іх неяк спецыялына кадыфікаваць. Нездарма вядомы крытык традыцыйнай савецкай канцэпцыі феадалізму І.Я.Фраянаў не бачць на ўсходнеславянскіх землях феадалізму амаль да XII ст. Можа, гэта і занадта. Але сярэднявечча (калі яго апаесамляць у Еўропе з феадалізмам) магчыма пачынаць на ўсход ад Эльбы толькі з мяжы I/II тыю. і неяк не раней. Дарэчы, у гэтыя ж храналагічныя рамкі ўпісываюцца і працэсы пачатку феадалізацыі ў балтыйскіх землях.

Такім чынам, наша сярэднявечча - гэта, у агульных межах - X -сярэдзіна XIX стст. У чым жа ягоная спецыфічнасць? Менавіта ў існаванні паміж Еўропай і Ўсходам.

Заходняя частка славянства і Прыбалтыка, у выніку геаграфічнай, перш на перш, блізкасці да Заходней Еўропы пастаянна ў сярэднявеччы атрымоўвала адтуль імпульсы больш дынамічнай цывілізацыі (праз розныя шляхі - ад каталіцызму і лацінскай культуры да нямецкай каланізацыі і крыжацкай агрэсіі). Яны павольна, паступова, змянялі менталынасць і мірапогляды розных слаеў заходнеславянскага грамадства ў агульнаеўрапейскім напрамку. Вынік гэтага працэсу мы і бачым сёння.

Падняпроў'е жа апынулася на памежжы еўрапейскага свету і ўсходкіх намадаў. Суседства з апошнімі, як і на класічным Усходзе, не дазволіла сярэднявечным саслоў'ям - сялянам і феадалам пераадолець традыцыі патрыархальнага землекарыстання (з пачатку абшчыннага, затым дзяржаўнага), што паўсюдна стварала ўмовы для дэспатызму. Аддаленасць ад качэўнікаў, напрыклад, паўночна-заходней часткі ўсходніх славян паслрыяла стварэнню феномена Ноўгарада і Пскова, якія, з шэрагам агаворак пра ролю там баярства, былі астраўкамі еўрапейскіх парадкаў у рэгіёне.

Нашыя землі з пачатку сярэднявечча развіваліся, пры ўсіх дыскусіях на гэты конт, у рамках агульных усходнеславянскіх лёсаў. Балтаславянскія этнічныя працэсы не змянілі напрамак развіцця, бо з пачатку ўсходнеславянскага рассялення з Сярэдняга Падняпроў'я балцкія плямены былі яшчэ больш першабытнымі, чым славяне. І толькі ў першыя стагоддзі II тыс. энтічныя літоўцы пераадолелі першабытнасць і перайшлі да раннедзяржаўнага ладу. У далейшым, у межах ВКЛ, пачалася «вестэрнізацыя» беларускага грамадства. Але ў адрозненне ад аналагічных працэсаў у заходнеславянскіх землях, заходнія імпульсы трансляраваліся сюды «праз паерэднікаў», былі больш згладжанымі і ўспрымаліся перш на перш



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

найбольш дынамічнымі ў тыя часы слаямі фамадства - дваранствам і гараджанамі. Сказваліся канфессійныя адрозненні сярод насельніцтва ВКЛ, якія кансервавалі традыцыйны ўклад жыцця, асабліва на ўсходзе і сярод сялян.

Пазней палітычны лёс Вялікага княства Літоўскага паспрыяў збліжэнню нашых земляў праз Польшчу з некаторымі заходнімі цывілізацыйнымі прыкметамі: зямельная рэформа ў рэчышчы «нямецкага права» (Устава на валокі), гарантаваныя шляхецкія правы, гарадское самакіраванне. Характэрна, што пераўтварэнні ў найбольш кансерватыўнай сферы - сялянскім землеўладанні хутчэй і радыкальней адбываліся на захадзе беларускіх зямель. Пэўныя змены ў светапоглядах адлюстроўваліся ў рэлігійных рухах і ў з'яўленні ўніятства. Але наступныя палітычныя катаклізмы зноў вярнулі нашых продкаў ва ўсходнееўрапейскую цывілізацыю, у межах якой (у сучаснай яе мадыфікацыі) мы, дарэчы, знаходзімся і цяпер.

Такім чынам, сярэднявечную гісторыю беларускіх зямель можна характэрызаваць як цывілізацыйна нестабільную. З пачатку эпохі яе характэрызавалі агульныя ўсходнеславянскія рысы. У далейшым блізкасць да Цэнтральнай Еўропы стварала перадумовы для ўспрыймання яе шляху развіцця, але на рубяжы сярэднявечча і новага часу гэтыя перадумовы не рэалізаваліся. Беларусь засталася на мяжы паміж захадам і ўсходам Еўропы, але ўжо з ўсходняга боку. Магчыма першабытнаабшчынныя (калектывісцкія) традыцыі захаваліся ў нас недзе на ментальнам узроўні і аказаліся арганічнымі менавіта ў межах усходнееўрапейскай цывілізацыі. Таму заходнія ўплывы большасцю насельніцтва ўспрымаюцца тут як знешнія.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова